ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ

# СВЯТА РОДНАЙ МОВЫ І ТВОРЧАСЦІ

**СЛОНІМ. 21 лютага ў горадзе над Шчарай Міжнародны дзень роднай мовы адсвяткавалі з удзелам сучасных паэтаў-землякоў.**



У Міжнародны дзень роднай мовы, 21 лютага і ў рамках правядзення Тыдня роднай мовы па запрашэнні настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Амелькові Галіны Іванаўны ў СШ № 2 г. Слоніма адбылася сустрэча вучняў 9-11 класаў з членамі Слонімскага раённага літаратурнага аб'яднання імя Анатоля Іверса, якое існуе пры газеце «Слонімскі веснік».

Кіраўнік літаб'яднання, член Саюза пісьменнікаў Беларусі паэтэса Ірына Войтка распавяла школьнікам пра багатыя літаратурныя традыцыі Слонімшчыны, пра работу Слонімскага раённага літаб'яднання і супрацоўніцтва з Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі. Літаратар таксама прачытала ўзнёслыя вершы пра родную мову і Беларусь.

Паэтэса Тамара Пяцеліна прачытала вершы пра любоў да Радзімы, да роднага горада, да роднай мовы, падарыла школе сваю новую кнігу «А я бреду по сентябрю».

Выпускнік гэтай жа школы, а зараз пенсіянер Мікалай Антонавіч Емельянчук расказаў пра свае спартыўныя дасягненні падчас вучобы ў школе, прачытаў сатырычныя вершы пра розныя з'явы сучаснага жыцця.

Аўтар і выканаўца песень Галіна Эдуардаўна Урадзімская праспявала некалькі сваіх кампазіцый пра родную старонку і горад Слонім. Вучні з задавальненнем праслухалі выступленні гасцей, задалі пытанні. Сустрэча прайшла цікава і нават хвалююча.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-СЛОНІМ**

**На фота:** Міжнародны дзень роднай мовы ў СШ № 2 г. Слоніма з удзелам прадстаўнікоў Слонімскага раённага літаратурнага аб’яднання імя Анатоля Іверса (кіраўнік член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Ірына Войтка).











Кіраўнік літаб’яднання, член Саюза пісьменнікаў Беларусі паэтэса Ірына Войтка распавяла школьнікам пра работу Слонімскага раённага літаб’яднання і супрацоўніцтва з Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі.



Выступае паэтэса Тамара Пяцеліна




Паэт Мікалай Емельянчук



Выступае аўтар і выканаўца песень Галіна Урадзімская



Сваё вершы чытае паэтэса Ірына Войтка



Пытанні ад зацікаўленай моладзі



СШ № 2 г. Слоніма. 21 лютага 2023 года

